**С.А. Юрыс**
*(ГДТУ імя П.В.Сухога, г. Гомель, Беларусь, juris.sergey@rambler.ru)*

# СПАЖЫВЕЦКАЯ КААПЕРАЦЫЯ ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў ПЕРШЫЯ ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ

Перад Вялікай Айчыннай вайной спажыўкааперацыя Гомельшчыны выглядала як дастаткова магутная сістэма, якая дынамічна развівалася. Тавараабарот спажыўкааперацыі ў 1940 годзе складаў 212 млн руб. (30,7 % ад усяго тавараабароту вобласці) [1, с. 22]. На пачатак 1941 года ў вобласці налічвалася 100 сельпо, якія аб’ядноўвалі ў сваіх радах 124 046 пайшчыкаў [2, с. 4]. Рознічная гадлёвая сетка налічвала 1 095 магазінаў і ларкоў.

Вайна нанесла вялікі матэрыяльны ўрон, было страчана больш за 40 % матэрыяльнай базы кааператыўных арганізацый. Па меры вызвалення ўсходніх абласцей рэспублікі, у адпаведнасці з пастановай СНК БССР ад 19 кастрычніка 1943 года пачалося аднаўленне кааператыўнай гаспадаркі. У другой палове 1943 года аднавіў сваю дзейнасць Гомельскі аблспажыўсаюз.

Сістэма сельпо з-за няхваткі гандлёвых работнікаў, памяшканняў для магазінаў, лавак і складоў аднаўлялася павольна. Першапачаткова ўсё гандлёвае абслугоўванне насельніцтва, забечпячэнне хлебам, развіццё грамадскага харчавання ўскладвалася на райспажыўсаюзы.

Праўленнем аблспажыўсаюза была распрацавана праграма развіцця прадпрыемстваў рознічнага гандлю і грамадскага харчавання, баз і складоў. Адзначым, што значная частка збярогшыхся за гады вайны будынкаў магазінаў, баз і складоў прыйшла ў заняпад і патрабавала рамонту. Неабходна было правесці вялікую работу, бо да 1945 года ўся гандлёвая сетка кааперацыі вобласці складала 30 % ад даваеннага ўзроўню, у тым ліку сельмагаў – 21 %. На 01.01.1945 года ў Гомельскай вобласці было створана 92 сельпо, налічвалася 66 544 пайшчыка, рознічная гандлёвая сетка складалася з 377 магазінаў, палатак і ларкоў, 13 прадпрыемстваў грамадскага харчавання, 11 хлебапякарань і 11 прадпрыемстваў па выпуску тавараў спажывання [3, с. 171].

З пераходам да аднаўлення народнай гаспадаркі ў спажывецкай кааперацыі пачалася падрыхтоўка да адмены карткавай сістэмы: былі адрамантаваны гандлевыя памяшканні і хлебапякарні, вялікая ўвага ўдзялялася будаўніцтву новых гандлёвых кропак. У выніку перыяд 1946 – 1947 гадоў характэрызаваўся самымі высокімі тэмпамі прыроста гандлёвай сеткі – 132 – 137 %, якія да пачатку пяцідзесятых гадоў стабілізаваліся на ўзроўні 102 – 104 % [5, с. 9]. Разам з тым неабходна адзначыць, што аднаўленне гандлёвай сеткі спажыўкааперацыі ішло з вялікай цяжкасцю і нават на 01.01.1951 года яна дасягнула толькі 73,5 % да даваеннага ўзроўню [4, с. 9].

Першыя пасляваенныя гады з’явіліся часам пашырэння сферы дзейнасці спажыўкааперацыі. Адносіны да яе змяніліся. Пастанова Савета Міністраў СССР ад 9 лістапада 1946 года «Аб разгортванні кааператыўнага гандлю ў гарадах і пасёлках харчовымі і прамысловымі таварамі і аб павялічэнні вытворчасці харчавання і тавараў шырокага ўжытку кааператыўнымі прадпрыемствамі» сведчыла пра новы этап у развіцці спажывецкай кааперацыі. У пастанове дзейнасць спажывецкай кааперацыі была прызнана нездавальняючай. Указвалася, што яна абмежавала сваю ролю размеркаваннем дэфіцытных тавараў, атрымоўваемых ад дзяржавы. Лішкі сельскагаспадарчай сыравіны, якія меліся ў вёсцы, не закупляліся для забеспячэння гарадскога насельніцтва, кааператары не разгортвалі ў неабходных памерах вытворчасць тавараў шырокага ўжытку і прадуктаў харчавання [5, с. 3 – 17]. Такім чынам, у пастанове ўтрымоўвалася кастата-

цыя існуючай сітуацыі, аналіза ж глыбінных прычын зроблена не было. Тым не менш спажыўкааперацыя атрымала права разгарнуць сваю дзейнасць ў гарадах. Гэтага права яна была пазбаўлена яшчэ ў 1935 годзе.

Вырысоўваліся асноўныя рысы новага этапа гандлю: канкурэнцыя паміж дзяржаўным і кааператыуным гандлем па абслугоўванню гарадского і сельскага спажыўца; пашырэнне сферы ўжывання цэн, якія складваліся на рынку.

Нягледзячы на тое, што фактычныя памеры тавараабароту кааператыўнай сеткі ў гарадах і пасёлках былі далёкімі ад запланаваных, спажыўкааперацыя вобласці актыўна ўплывала на ўзровень рознічных цэн на сельгаспрадукты. Так, у 1947 годзе кааператыўныя цэны ў гарадах былі на 10 – 12 % ніжэй цэн калгаснага рынку [6, с. 83,145,170]. У пачатку 1948 года ў кааператыўных магазінах Гомельскай вобласці яны былі на 15 – 20 % ніжэй за дзяржаўныя рознічныя цэны. Насельніцтву было больш выгадна купляць харчовыя тавары ў магазінах спажывецкай кааперацыі, чым на рынку. Гэта садзейнічала паніжэнню рынaчных цэн (мяса патанела на 40 %, малако – на 50 %, бульба і гародніна – на 60 %).

Ва ўмовах, калі будучыня кааператыўнай уласнасці бачылася як паглынанне яе дзяржаўнай уласнасцю палітыка ў адносінах да кааперацыі, у тым ліку і спажывецкай, была непаслядоўнай. 8 жніўня 1949 года пастановай Савета Міністраў СССР гарадскі кааператыўны гандаль Цэнтрасаюза быў перададзены Міністэрству гандлю.

Такім чынам, лінія на развіццё канкурэнцыі паміж дзяржаўным і кааператыўным гандлем была звернута. Ізноў за спажывецкай кааперацыяй заставалася права гандляваць толькі ў сельскай мясцовасці. Матывавалася гэта тым, што спажыўкааперацыя, не спраўляючыся з абслугоўваннем сельскага насельніцтва, адцягвалася для работы ў горадзе. Гэта сцвярджэнне сведчыла пра неразуменне сутнасці спажывецкай кааперацыі як гаспадарчай арганізацыі прызначанай закупляць лішкі сельскагаспадарчых прадуктаў у вёсках, перапрацоўваць іх і прадаваць як на сяле, так і ў горадзе. Рознічная гандлёвая сетка кааператыўных таварыстваў была ліквідавана ў гарадах. Неабаснаваны быў вывад аб адцягваннні спажыўкааперацыі для гарадского гандлю ва ўрон сельскаму насельніцтву. Гарадская гандлёвая сетка спажыўкааперацыі вобласці на 01.01.1948 года налічвала 31 магазін, а сельская 685. У 1949 годзе на долю горада прыходзілася толькі 24,45 % тавараабарота.

У пасляваенны перыяд спажыўкааперацыя з’яўлялася адной з асноўных нарыхтоўчых арганізацый. Атрымаўшы згодна з пастановай Савета Міністраў СССР ад 9 лістапада 1946 года права на закупкі па рынaчных цэнах у насельніцтва сельгаспрадукцыі, спажывецкія арганізацыі павялічылі аб’ём нарыхтовак. Так, у Гомельскай вобласці ў тавараабароце спажывецкай каааперацыі ў 1947 годзе ўдзельная вага дэцэнтралізаваных закупак склала ўжо 14,8 % супраць 9,6 % у 1946 годзе [7, арк. 508].

Ва ўмовах недастатковай забяспечаннасці транспартам, складскімі памяшканнямі агароднінасховішчамі, арганізацыя нарыхтоўчай дзейнасці праходзіла цяжка. У цэлым толькі 67 – 69 % сельпо прымалі ўдзел у нарыхтоўках. Гэта прыводзіла да падаражання прадукцыі, таму што закупкі праводзіліся ў бліжэйшых да раённых цэнтраў сельпо, а не ў глыбінцы, дзе цэны былі больш нізкімі. Вынікам была беднасць асартыменту гарадскіх магазінаў. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, толькі за 1947 – 1948 гады спажыўкааперацыяй рэспублікі было закуплена сельгаспрадукцыі на 656,2 млн руб [4].

Аднак змены ў адносінах да кааператыўнай формы гаспадарання, якія з’явіліся ў канцы саракавых гадоў, закранулі і нарыхтоўчую дзейнасць спажывецкай кааперацыі. Пастановай Савета Міністраў ад 8 жніўня 1949 года адменена права спажыўкааперацыі закупліваць прадукты па рыначных цэнах. Замест гэтага была ўведзена закупка сельгаспрадукцыі па абмежаваных закупачных цэнах, рэгуліруемых дзяржавай, значна больш нізкіх, чым рыначныя.

Такі курс прывёў да рэзкага скарачэння аб’ёмаў закупак сельгаспрадуктаў. Так, Гомельскім аблспажыўсаюзам у 1949 годзе гадавы план закупак бульбы выкананы на 12 %, гародніны на 15 %, сухіх грыбоў на 1 % [8, с. 429].

Каб лепш забяспечыць насельніцтва прадуктамі харчавання і прамысловымі вырабамі, спажыўкааперацыя ў пасляваенны час прыступіла да арганізацыі ўласных прадпрыемстваў па вытворчасці тавараў шырокага ўжытку на базе мясцовых сыравінных рэсурсаў (раней яе вытворчая дзейнасць абмяжоўвалася хлебавыпяканнем, вытворчасцю безалкагольных напояў і перапрацоўкай сельскагаспадарчых прадуктаў). Пастанова Савета Міністраў СССР ад 9 лістапада 1946 года паскорыла працэс стварэння такіх прадпрыемстваў.

Да сярэдзіны 1947 года ў Гомельскай вобласці створана іх было 46. За I квартал 1947 года яны выпусцілі тавараў на 2 млн 327 тыс. руб, пры плане 900 тыс. руб. [1]. Большасць з гэтых прадпрыемстваў былі па сутнасці дробнымі прадпрыемствамі, аснашчанымі прымітыўным абсталяваннем, з колькасцю працуючых ад 3 да 5 чалавек. Якасць была невысокай, але гэта былі вельмі неабходныя для насельніцтва тавары: дахавае крыццё, ганчарныя вырабы, мыла, мэбля, сані, граблі, вёдры, хамуты, вяроўка, адзенне і шмат іншых. Дэфіцыт гэтых тавараў быў значным і, бясспрэчна, прадпрыемствы спажыўкааперацыі памагалі насыціць рынак.

У з’яўленні шматлікіх прамысловых кааператыўных прадпрыемстваў праявілася тэндэнцыя развіцця новага гаспадарчага механізму, накіраваная на пэўнае пашырэнне гаспадарчай самастойнасці прадпрыемстваў і ўкараненне гасразліку.

Гэты працэс паскорылі і некаторыя нарматыўныя акты. У асобнасці, пастанова Савета Міністраў СССР ад 14 красавіка 1948 года «Аб пранік-

ненні прыватніка ў кааперацыю і прадпрыемствы мясцовай прамысловасці», якая прывяла да масавага закрыцця многіх кааператыўных прадпрыемстваў.

Улічваючы рэальны стан на спажывецкім рынку ў тыя гады, патрэбна прызнаць, што закрыццё прадпрыемстваў спажыўкааперацыі было відавочна неабгрунтавана. Да таго ж кааператыўныя прадпрыемствы садзейнічалі стварэнню перадумоў для наладжвання аптымальных суадносін паміж значнай, сярэдняй і дробнай вытворчасцю. Яны выпускалі парадўнальна невялікія партыі тавараў, выпуск якіх было цяжка ці эканамічна нявыгадна арганізаваць на вялікіх прадпрыемствах.

### *Спіс літаратуры*


1. Дзяржаўны архіў грамадскіх арганізацый Гомельскай вобласці. – Фонд 144. – Воп. 13. – Спр. 26. – С. 22.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 7. – Воп. 3. – Спр. 1226. – С. 4, 6.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 332. – Воп. 5. – Спр. 245а. – С. 171.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 322. – Воп. 5. – Спр. 255а. – С. 9.
5. Сборник правительственных постановлений и ведомственных указаний о кооперативной торговле в городах и поселках. – М., 1947. – С. 3 – 17.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 4. – Воп. 44. – Спр. 53. – С. 83, 145, 170.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 332. – Воп. 5. – Спр. 33. – Арк. 508.
8. Дзяржаўны архіў грамадскіх арганізацый Гомельскай вобласці. – Фонд 144. – Воп. 20. – Спр. 23. – С. 429.